**Установа адукацыі**
**“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”**

**Зацвярджаю**

**Загадчык кафедры культуралогіі**

**____________ А.І. Смолік**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА – МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
па дысцыпліне

# “АКСІЯЛОГІЯ КУЛЬТУРЫ”

**Складальнікі: ст. выкл. Свечнікава А.У.**

**Вучэбна-метадычны комплекс зацверджаны на пасяджэнні кафедры культуралогіі 25.09.2012 года, пр.№1**

2012

**ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА**

Каштоўнасці з’яўляюцца адной з фундаментальных праблем для ўсяго гуманітарнага і сацыяльна-навуковага пазнання. Аналіз каштоўнасцей уваходзіць у якасці аксіялагічнага кампанента ў шэраг культуралагічных канцэпцый. У культуралагічным пазнанні праблема каштоўнасцей займае асабістае месца, перш за ўсё, у сувязі з шырока распаўсюджанным разуменнем культуры як сукупнасці ўсіх каштоўнасцей, якія стварыла чалавецтва, што робіць яе спецыфічным аб’ектам культуралагічнага вывучэння.

Культуралагічныя веды паўстаюць як веды аксіялагічныя таксама і ў кантэксце інтэрпрэтацыі культуры як рэгулятыўна-нарматыўнай галіны чалавечай жыццядзейнасці. Паколькі каштоўнасці побач з нормамі, узорамі, ідэаламі – важнейшыя кампаненты гэтай рэгулярнай сістэмы.

Аксіялагічная праблематыка ў культуралогіі існуе ў кантэксце распрацоўкі праблемы ідэалаў, разнастайных феноменаў культуры. У сувязі з гэтым тэарэтычны аналіз розных каштоўнасных сістэм шырока прадстаўлены ў замежнай і культуралагічнай думцы.

Павышаны тнтарэс да праблемы вывучэння каштоўнасцей у сучасных умовах тлумачыцца духоўным крызісам, ломкай сфарміраваўшыхся і існаваўшых шмат дзесяцігоддзяў каштоўнасцей савецкай культуры, пошукам новых культуралагічных асноў і каштоўнасных арыентацый постсавецкага грамадства.

Мэтай вучэбнага курса ―Аксіялогія культуры” выяўленне аксіялагічнага кантэкста культуры, сутнасці функцый, тыпаў і ведаў, месца і ролі каштоўнасных сістэм у кансалідацыі грамадства, сацыялізацыі і інкультурацыі асобы.

*Падчас выкладання дадзенай вучэбнай дысцыпліны вырашаюцца наступныя задачы:*

– раскрыццё разнастайнасці трактовак цэнтральнага для аксіялогіі паняцця ―каштоўнасць”;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– абгрунтаванне магчымасці існавання каштоўнасцей у структуры быцця і іх сувязі з прадметнай рэчаіснасцю;

– выяўленне механізмаў узнікнення, вектараў і стадый змены каштоўнасцей;

– назапашванне студэнтамі тэарэтычных ведаў, неабходных для аналіза аксіялагічных асноў розных ведаў сацыякультурнай практыкі.

*У выніку засваення тэм вучэбнага курса студэнт павінен ведаць:*

– змест і сутнасць аксіялагічных ведаў, тэорыю каштоўнасцей;

– аксіялагічную праблематыку ў культуралогіі;

– рангі каштоўнасцей і іх характарыстыкі;

– канцэпцыі аксіялагічнага плюралізма;

– аксіялагічны аспект вывучэння культурных паводзін індывіда.

*Студэнт павінен умець:*

– аналізаваць іерархічныя структуры каштоўнасцей розных кльтур;

– уводзіць складальнікі агульнай тэорыі каштоўнасцей у канкрэтна-гістарычны культурны кантэкст;

– выяўляць каштоўнасна-нарматыўны змест і сэнс такіх феноменаў, як рэлігія, палітыка, маральная культура, характар іх суадносін паміж сабой;

– даследаваць аксіялагічныя асновы розных відаў сацыякультурнай практыкі;

– з пазіцый агульнай тэорыі каштоўнасцей інтэрпрэціраваць свет культуры.

*Метады (тэхналогіі) навучання*

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);
– метад аналізу канкрэтных сітуацый;
– гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях, і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучаснай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі выпускніка ВНУ ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго гадзін | лекцый | семінарскіх заняткаў |
| Уводзіны. | 1 | 1 | |
| **Тэма 1.** Каштоўнасці і іх сутнасць. Функцыі, тыпы і віды каштоўнасцей | 4 | 3 | 1 |
| **Тэма 2.** Вытокі каштоўнаснай свядомасці суб'екта культуры і яго культуратворчай дзейнасці | 1 | 1 | |
| **Тэма 3.** Аксіялагічныя асновы культуры | 1 | | 1 |
| **Тэма 4.** Каштоўнасны змест прадметных форм  культуры | 2 | 1 | 1 |
| **Тэма 5.** Аксіялагічныя асновы культур старажытных цывілізацый Усходу | 3 | 2 | 1 |
| **Тэма 6.** Аксіялагічная значнасць рэчаіснасці ў суб'ектаў афрыканскіх культур | 1 | 1 | |
| **Тэма 7.** Аксіялагічнае вымярэнне культуры класічнага арабскага Усходу | 2 | 1 | 1 |
| **Тэма 8.** Матывы каштоўнасных пераваг чалавека ў антычнай культуры | 4 | 2 | 2 |
| **Тэма 9.** Пераацэнка каштоўнасцей культуры ў эпоху Сярэднявечча | 2 | 1 | 1 |
| **Тэма 10.** Аксіялагічны кантэкст культуры эпохі Адраджэння | 2 | 1 | 1 |
| **Тэма 11.** Дыферэнцыяцыя арэала каштоўнасцей у еўрапейскай культуры Новага часу | 2 | 1 | 1 |
| **Тэма 12.** Змена каштоўнасных арыенціраў у эпоху Асветніцтва | 3 | 1 | 2 |
| **Тэма 13.** Дыялектыка адноснага і абсалютнага ў каштоўнаснай свядомасці грамадства індустрыяльнага свету | 3 | 1 | 2 |
| **Тэма 14.** Сутнасць каштоўнасці сацыякультурнага быцця ўсходнеславянскіх народаў | 3 | 1 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Тэма 15.** Этнічныя каштоўнасці беларусаў | 2 | 1 | 1 |
| **Тэма 16.** Каштоўнасці сацыялістычнай культуры | 3 | 1 | 2 |
| **Тэма 17.** Аксіялагічная спецыфіка культуры XXI ст. | 3 | 2 | 1 |
| **Тэма 18.** Сістэма каштоўнасцей у прасторы заходняй культуры | 4 | 2 | 2 |
| **Тэма 19.** Каштоўнасная рэгуляцыя сацыякультурных працэсаў ва ўмовах глабальнай трансфармацыі сучаснага соцыума | 2 | 2 | |
| Усяго… | 48 | 26 | 22 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Змест дысцыпліны
## Уводзіны

Значэнне дысцыпліны ―Аксіялогія культуры" ў падрыхтоўцы культуралагічных кадраў. Прадмет, змест, мэта і задачы, структура вучэбнага курса. Міжпрадметныя сувязі дадзенай дысцыпліны. Віды вучэбных заняткаў. Крыніцы інфармацыі па праблематыцы вучэбнай дысцыпліны. Формы кантролю.

Характарыстыка асноўных катэгорый аксіялогіі культуры як навукі аб каштоўнасцях. Культура як сукупнасць матэрыяльных, духоўных і сацыяльных каштоўнасцей. Паняцце каштоўнасці. Метады аксіялагічных даследаванняў. Месца ―Аксіялогіі культуры" сярод гуманітарных навук (філасофія, псіхалогія, сацыялогія, культуралогія і інш.).

### Тэма 1. Каштоўнасці і іх сутнасць. Функцыі, тыпы і віды каштоўнасцей

Узаемасувязь каштоўнасцей, нормаў, ідэалаў і мэт. Залежнасць каштоўнасцей ад патрэбнасцей асобы. Каштоўнасць – мэта і каштоўнасць – сродак. Іерархія каштоўнасцей. Рэальныя, дэкларуемыя і сімвалічныя (уяўляемыя) каштоўнасці. Асобасныя і сацыяльныя, кардынальныя і субкардынальныя каштоўнасці. Агульначалавечыя каштоўнасці. Абсалютныя каштоўнасці грамадства.

Функцыі каштоўнасцей. Мадэліраванне каштоўнасцей. Дынаміка каштоўнасцей. Прынцыповае адрозненне каштоўнасцей даіндустрыяльных культур ад індустрыяльных і постіндустрыяльных. Каштоўнасці і культурная дынаміка.

### Тэма 2. Вытокі каштоўнаснай свядомасці суб'екта культуры і яго культуратворчай дзейнасці

Разуменне каштоўнасці як дабра ў эпоху антычнасці. Бог як крыніца дабра у культуры Сярэднявечча. Каштоўнасць як значнасць (В. Віндельбанд, Г. Рыкерт, Г. Коген). Апрыёрная, трансцендентальная прырода каштоўнасцей. Праблема залежнасці каштоўнасцей ад пачуццяў (В. Вундт, Ф. Брэнтано). Ідэалістычнае разуменне каштоўнасцей (М. Бярдзяеў, М. Лоскі).

Сацыяльная і канвенцыяльная прырода каштоўнасцей (М. Вэбер, Э. Дзюркгейм). Аксіялагічная спецыфіка і унікальнасці цывілізацый (М. Данілеўскі, А. Тойнбі, О. Шпенглер).

Эвалюцыя рэлігійных каштоўнасцей ад анімістычных уяўленняў да развітых этычных сістэм сусветных рэлігій (Э. Тайлор).

Татальнае пераасэнсаванне каштоўнасцей Ф. Ніцшэ. Спецыфіка аксіялогіі еўрапейскай (―фаустаўскай") культуры і канстатацыя яе дэградацыі. Ідэя аб адноснасці каштоўнасцей.

Каштоўнасці ў складзе ідэалагічнай пабудовы над базісам вытворчых адносін (К. Маркс. Ф. Энгельс, У. Ленін).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Несвядомае і яго роля ў фарміраванні духоўных каштоўнасцей (З. Фрэйд,
К. Юнг). Рэпрэсіўны характар каштоўнасна-нарматыўнай сістэмы культуры. Сувязь калектыўнага несвядомага з дамінуючымі ў грамадстве каштоўнасцямі.

### Тэма 3. Аксіялагічныя асновы культуры

Рэлігійныя каштоўнасці і іх дынаміка. Адпаведнасць рэлігійных ісцін псіхалагічным патрэбнасцям чалавека. Супярэчнасць рэлігійных каштоўнасцей і навуковай карціны свету.

Мараль – неад’емная частка культуры. Мараль як сукупнасць правілаў і норм паводзін у грамадстве. Функцыі маралі. Асобасная і сацыяльная мараль як антытэза. Маральная ацэнка паасобных з’яў грамадскага жыцця. Учынкаў і матываў дзейнасці суб’ектаў культуры.

Ідэалогія як выражэнне каштоўнасцей у палітыцы. Сувязь ідэалогіі з каштоўнасцямі сацыяльных страт (каштоўнасці лібералізма, кансерватызма, сацыялізма, нацыяналізма і іншых ідэалогій).

Аксіялагічныя асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы. Пошук нацыянальнай ідэі і каштоўнасцей.

Каштоўнасць навукі і яе адрозненні ад звычайных ведаў, міфа і паранавукі. Аксіялагічныя асновы навукі: пошук ісціны, карысць. Суадносіны каштоўнасцей навукі і агульначалавечых каштоўнасцей.

Мастацтва як скарбніца і рэтранслятар эстэтычных і духоўных каштоўнасцей. Сувязь мастацтва з аксіялагічным кантэкстам пэўнай эпохі. Эстэтычныя катэгорыі як адлюстраванне эстэтычных каштоўнасцей.

### Тэма 4. Каштоўнасны змест прадметных форм культуры

Калектыўны розум, усеагульная роўнасць, умельства як каштоўнасць у перыяд гістарычна першага этапа эвалюцыі чалавека. Матэрыяльныя каштоўнасці: разнастайныя прылады працы, жыллё. Звычаі і абразнасць вытворчага характару першабытных людзей. Грамадская праца – калектыўная вытворчасць.

Прырода як роўнацэнная чалавеку субстанцыя. Татэмы і індывідуальныя субтатэмы. Веды пра навольнае асяроддзе.

Абрадавыя каштоўнасці. Узроставыя ініцыяцыі на стадыі антропасацыягенезу. Сацыяльныя ўстаноўкі, звычаі, рытуал, табу. Звычаёвыя правілы. Рэлігійна-містычныя каштоўнасці. Культ жывёлы. Культ продкаў.

Асэнсаванне каштоўнасці жыцця і сям’і. Каштоўнасць індывіда. Уменні і формы арганізацыі жыццядзейнасці людской супольнасцю і асобнымі індывідамі.

Каштоўнасныя прыярытэты: культ фізічнай сілы, цярплівасць. Разумовыя, гутаркова-камунікатыўныя, вопытна-ведавыя якасці суб’екта першабытнай культуры.

Маральна-этнічныя каштоўнасці: мудрасць, мужнасць, дабрачыннасць, прэстыж.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каштоўнасці выхаваўчага і адукацыйнага зместу.

Культурна-прыкладныя каштоўнасці: дэкарырванне зброі, посуда, прылад працы, аддзення. Цацкі, упрыгожанні. Колер і яго сімвалічнае занчэнне. Сінкрэтычнае мастацтва.

## Тэма 5. Аксіялагічныя асновы культур старажытных цывілізацый Усходу

Каштоўнасць улады (богароўны цар-жрэц, інстытут царскай улады). Закон як каштоўнасць (Законы Хамурапі. Егіпецкае заканадаўства). Суддзя памерлых. Ідэя боскага суда і кары за грахі. Вера і пакорнасць Богу як каштоўнасць. Талерантнасць і асіміляцыя чужых багоў. Бессмяротнасць – галоўная і недасягальная каштоўнасць.

Каштоўнасць аднастайнасці і пастаянства. Каштоўнасць Слова (пісьмовага і сусветнага). Парадак як каштоўнасць.

Ісціна, справядлівасць, сумленнасць, праца, прыватная уласнасць, павага да багоў, да памерлых, да свяшчэнных жывёл, міласэрнасць, верацярпімасць, веды – важнейшыя каштоўнасці старажытных цывілізацый.

## Тэма 6. Аксіялагічная значнасць рэчаіснасці ў суб’ектаў афрыканскіх культур

Першая каштоўнасць, увасобленыя ў міфах: дабыча агня, выраб зброі, кавальская справа, земляробства, жывёлагадоўля, песні, танцы.

Зямля, лес як каштоўнасць. Свет жывых і свет памерлых. Смерць як адраджэнне, смерць як жыццё.

Вярхоўны Бог як вышэйшая каштоўнасць. Бог – творца як жывёла, трыксцер, маг і культурны герой.

Сацыяльныя каштоўнасці: правадыр, клан, тайныя таварыствы, міфічны культурны герой, парадак, матрылінейнасць, падначаленне старэйшым, павага да жанчын, пакланенне свяшчэнным аб’ектам.

Эстэтычныя каштоўнасці і іх адлюстраванне ў мастацтве. Натуралізм і абстракцыя ў жывапісу. Перавага выяў жывёлы. Сцэн палявання. Сімволіка чырвонага, белага і чорнага колераў.

## Тэма 7. Аксіялагічнае вымярэнне культуры класічнага арабскага Усходу

Культ стараабрадніцкіх племянных багоў. Сярэднявяковыя мусульманскія традыцыі. Іслам як цэласная культура. Суна – звод штодзённых звычаяў і правілаў паводзін старажытнай абшчыны. Любоў і мудрасць як важнейшыя каштоўнасці суфізма.

Сувязь веры з традыцыйным укладам жыцця. Каран як тэкст культуры. –Пяць сталпоў” іслама: ташшахуд, салят, саум, хадж, закят.

Этнічныя каштоўнасці іслама: быць справядлівым, плаціць дабром за дабро, за зло злом, быць шчодрым, дапамагаць бедным, усе роўныя перад богам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навука і адукацыя – важнейшыя каштоўнасці арабскай культуры. Арабская сістэма пісьма. Сінтэз філасофіі і тэалогіі. Прынцыпы этычнага абсалютызма і маральнага дагматызма. Арабеска, каліграфія і арнамент як галоўныя элементы арабамусульманскай культуры.

## Тэма 8. Матывы каштоўнасных пераваг чалавека ў антычнай культуры

Полісная мараль і яе калектывісцкая сутнасць. Традыцыйная этыка арыстакратыі. Народны суверэнітэт. Полісная дэмакратыя – важнейшая каштоўнасць Старажытнай Грэцыі.

Свабода – аснова антычнай класічнай дэмакратыі. Правы афінскіх грамадзян. Дабрадзейнасць і яе змест: добрадзейнасць розума, разважлівасці і умеранасці, справядлівасці.

Міфы і іх маральны кантэкст. Антрапамарфізм старажытнагрэчаскай рэлігіі. Сінтэз рэлігійнага культа і ведаў чалавека. Суадносіны логаса і космаса. Космацэнтрызм.

Гармонія. Мера. Суразмернасць – структурныя прынцыпы прыгажосці. Ідэнтыфікацыя прыгожага і дабра. Гарманічнасць цела як гармонія духа.

Шкала асноўных каштоўнасцей старажытнарымскай культуры: ідэя значнасці адзінаства грамадзянскай абшчыны, непарыўная сувязь дабрабыту індывіда з дабрабытам усяго калектыву, ідэя вярхоўнай улады народа, ідэя цеснай сувязі грамадзянскай абшчыны з багамі і героямі. Дабрачыннасці рымлян: мужнасць, вернасць, стойкасць, суровая нязломленасць, ганаровая годнасць, свабода, непахісная сумленнасць.

Культурныя каштоўнасці рымскай цывілізацыі.

Ідэал рэспублікі. Рымскае права. Тэарэтычныя і эмпірычныя навукі рымлян.

Мясцовыя традыцыі і грэчаскі ўплыў у рымскім мастацтве. Лацінская мова як сусветная каштоўнасць. Прагматычны характар мастацтва.

Грошы як галоўная жыццёвая каштоўнасць рымскай арыстакратыі. Эпаціруючая дэманстрацыя багацця. Каштоўнасць натоўпу.

## Тэма 9. Пераацэнка каштоўнасцей культуры ў эпоху Сярэднявечча

Каштоўнасці хрысціянскай культуры. Бог як галоўная сусветная творчая сіла. Сярэднявяковы монатэізм. Царкоўна-феадальная ідэалогія. Рэлігійна-аскетычныя погляды. Нецярплівасць да іншых ідэалогій. Парадокс сярэдневяковай культуры: перакрыжаванне народнай культуры з кльтурай ―вучоных". Легетымнасць, аграрнасць і нецярплівасць – рысы культуры Сярэднявечча. Манаполія царквы на інтэлектуальную адукацыю.

Схаластычная логіка і яе адлюстраванне ў тэалогіі. Рэцэпцыя антычнай спадчыны. Ідэя гармоніі веры і разума. ―Навука – служанка багасловія".

Інтэлектуальны падыход да працы і тэхнікі. Этас працы. Накірункі сярэдневяковай навукі: фізіка-касмалагічны; вучэнне аб святле; навукі аб душы; астролага-медыцынскія веды; алхімія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рыцарская субкультура і яе аксіялагічнае вымярэнне. Каштоўнасці гераічнага эпаса: храбрасць, сіла, вернасць, вайсковая доблесць. Маральна-этнічны вобраз рыцара. Ідэал духоўнай любові. Культ ―дамы сэрца". Культурнае каханне і яе сутнасць.

Аксіялогія народнай культуры. Масавая народна-святочная творчасць: навагоднія календы, гістрыёны, ваганты і іх паэзія, пляцовы фарс, карнавалы і інш.

Эстэтычныя каштоўнасці сярэдневяковай культуры. Формула ―мастацтва – біблія для непісьменных". Раманскае і гатычнае мастацтва як адлюстраванне свету сярдневяковага горада.

### Тэма 10. Аксіялагічны кантэкст культуры эпохі Адраджэння

Ідэі гуманізма – духоўная аснова культуры Адраджэння. Чалавек і яго розум – вышэйшая каштоўнасць. Сутнасць паняцця ―studiahumanitatis". Ідэал свабоднага развіцця чалавека. Гуманістычная этыка аб гармоніі інтарэсаў індывіда і грамадства. Гуманістычны светапогляд. Абсалютызацыя чалавечай асобы ў яе цэласнасці. Чалавек як адзінства разумнага і пачуццёвага. Бязмежныя творчыя магчымасці чалавека. Прынцып прыгожай творчай асобы.

Эстэтычнае і мастацкае мысленне эпохі Адраджэння. Арыентацыя мастацтва на імітаванне прыроды. Асалода як важнейшы прынцып успрымання твораў мастацтва. Сувязь мастацтва і навукі.

Каштоўнасці зямнога быцця: аналогія прыгажосці свету і цела чалавека, плоцкае каханне, разважлівасць, смеласць у прадпрыймальніцкіх справах, асэнсаванне асобасных здольнасцей і шырокіх магчымасцей, прэстыж сям'і, павага грамадзян, слава ў памяці нашых продкаў і інш.

Узвышэнне мірскога жыцця пад час Рэфармацыі. Працоўная этыка як увасабленне практыцызма, індывідуальнасці і прадпрымальніцтва.

### Тэма 11. Дыферэнцыяцыя арэала каштоўнасцей ў еўрапейскай культуры Новага часу

Стабілізацыя жыццёвых умоў як адметнасць XVII ст. Пералом у грамадскай свядомасці ідэалогіі гуманізма. Адчуванне трагічных супярэчнасцей. Трагічны гуманізм. ―Расслаенне" чалавека на частнага і родавага, на асобнага і саслоўнага, на эмперычнага і абстрактна-усеагульнага.

Новы тып светаадчування. Супярэчнасць, разарванасць, калізія, скепсіс і дуалізм – характэрныя рысы грамадскай думкі. Супрацьпастаўленне матэрыяльнага і духоўнага, прыроднага і боскага, эмацыянальнага і рацыянальнага. Маністычнае тлумачэнне свету: адзінства свету ў розуме (Р. Дэкарт); Бог – найбольш дасканалае існанне; пантэістычнае ўспрыманне Бога (Б. Спіноза); адзінства ў матэрыі (Т. Гобс); адзінства ў ідэальнай любові (Б. Паскаль).

Боскае як цэнтр вышэйшага розуму, справядлівасці, ісціны, міласэрнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Антыноміі барочнага мыслення: ―сугучнасці несугучнага” (concordiadis-cordans). Пачуццё бязмежнасці свету, трагічнай неабароненасці чалавека, несупастаўімасць малога чалавечага жыцця з нязменным, халодным, бясконцым бяздоннем Космаса. Супрацпастаўленне жыцця і смерці.

Няўстойлівасць, дынамізм, кантрастнасць, эмацыянальнасць, абагульненасць – вызначальныя рысы барочнай карціны свету.

### Тэма 12. Змена каштоўнасных арыенціраў у эпоху Асветніцтва

Рэформы, дэмакратычныя пераўтварэнні грамадства, асвета – змест культуры эпохі еўрапейскага Асветніцтва.

Тэхнічны прагрэс як новая еўрапейская каштоўнасць. Дэізм і яго новая сутнасць. Космапалітызм як адмаўленне патрятызму. ―Новы дух” эпохі. Век розума. Рацыяналізм – вызначальная рыса Асветніцтва.

Абсалютызацыя значнасці выхавання і фарміравання новага чалавека. Адмаўленне традыцый.

Каштоўнасці тэхнагеннай цывілізацыі. Каштоўнасць аб’ектаў і прадметных ведаў. Прынцып самаацэнкі аб’ектыўнай ісціны як фундаментальная каштоўнасць навукі. Каштоўнасная ўстаноўка на пастаяннае ўзбагачэнне аб’ектыўных ведаў аб свеце, пастаянную навізну даследаванняў.

Прагматызм – філасофія карысці. Грошы як новы культ эпахі. Атэістычны светапогляд. Грамадскі дэмактратычны ідэал Ж.-Ж. Русо.

Каштоўнасныя арыентацыі асветнікаў – энцыклапедыстаў (Дзідро, Вальтер, Мантэкс’е, Гельвецый, Гольбах, Тюрго, Бюфон і інш.). Вера ў добрую прыроду чалавека. Права на свабоду, шчасце як сутнасць прыроды чалавека. Прынцып падзелу ўлады. ―Слабая дзяржава” як ідэал. Прырода, Ісціна і Закон. Маральная свядомасць буржуазнага грамадства. Новая сістэма маральных каштоўнасцей. Добрадзейнасць як індывідуальная карысць. Працавітасць, цвярозасць розума, ашчаднасць, накіраванасць на рэальнае жыццё – асноўныя прынцыпы буржуазнай маралі.

Стылістычная цэласнасць мастацтва XVIII ст. Культ пачуцця і асалоды, арыентацыя на прыемнае і забаўляльнае – этычнае крэда. Эстэтычныя каштоўнасці ракако, класіцызма, сентыменталізма.

### Тэма 13. Дыялектыка адноснага і абсалютнага ў каштоўнаснай свядомасці грамадства індустрыяльнага свету

Пераацэнка каштоўнасцей буржуазнай цывілізацыяй XIX ст. Рацыяналізм, антрапацэнтрызм, сцыентызм, еўрапацэнтрызм – базісныя каштоўнасці культуры індустрыяльнага грамадства.

Дэмакратыя, эксперыментальная навука і індустрыялізацыя як важнейшыя дэтэрмінанты радыкальных змен у Еўропе (Х. Ортэга-и-Гасэт). Праца і вытворчасць, ідэал і ідал буржуазнага грамадства.

Тэхнічны прагрэс – галоўная каштоўнасць індустрыяльнай цывілізацыі. Вера ў чалавека-пераўтваральніка і актыўную ролю яго розума. Рэвалюцыя ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыродазнаўстве. Пераход на пазіцыі біялагічнага рэдукцыянізма гуманітарных навук. “Машынны век”.

Утылітарны характар этыкета. Інструментальнае, утылітарнае выкарыстанне чалавека праз этыкет. Падзенне маральных каштоўнасцей. Філасофскі і сацыялагічны імаралізм. Крызіс хрысціянскага светапогляду і маралі (Ф. Ніцшэ). Адмаўленне каштоўнасцей хрысціянскай культуры. Разбурэнне сістэмы традыцыйных каштоўнасцей.

Абміршчэнне мастацтва. Адсутнасць адзінай эстэтычнай дамінанты (родавай, відавой, жанравай). Камерцыялізацыя мастацтва. Масавае тыражыраванне прадметаў мастацтва. Эпоха рамантызма і эпоха дэкаданса. Рэалізм як тып культуры XIX ст.

## Тэма 14. Сутнасць каштоўнасці сацыякультурнага быцця ўсходнеславянскіх народаў

Традыцыйныя каштоўнасці славянскіх супольнасцей. Аксіясфера язычніцтва і аксіясфера хрысціянства. Праваслаў’е і сістэма яго каштоўнасцей. Усходнеславянская дзяржаўнасць як Праваслаўнае царства. Рэлігіна-духоўнае вымярэнне дзяржаўнага жыцця ўсходніх славян. Этатызм як асобыя каштоўнасныя адносіны да дзяржавы.

Каштоўнасці Веры і Разімы. Зямля, прырода і поліэтнічнасць як гістарычная каштоўнасць. Адлюстраванне іерархіі каштоўнасцей у помніках кніжнай культуры: “Руская праўда”, “Дамастрой” і інш.

Гуманістычныя каштоўнасці ўсходніх славян: духоўная чысціня, цярплівасць, устрыманне, выхаванасць і павага да старэйшых, лагоднасць, пакорлівасць, бясстраснасць, любоў да блізкага і інш. Адносіны да працы, уласнасці, багацця і беднасці.

Каштоўнасць ведаў. Пачуццё адзінства, калектыўная свядомасць усходніх славян. Каштоўнасць калектыўнага выжывання і аскезы. Антропасацыяцэнтрызм парадыгмы калектыўнай свядомасці. Цэласнасць, адзінства, устойлівасць, гармонія калектыву як каштоўнасць. Дамінанта абшчыны ў свядомасці ўсходніх славян. Прынцып саборнасці.

Каштоўнасная мадэль свету ўсходніх славян. Вось славянскай карціны свету.

Дамінанты ўсходнеславянскай ментальнасці. Духоўная сутнасць усходнеславянскага хаоса. Патэрналізм і эгалітарызм у ментальнасці славянскай супольнасці. Сацыяцэнтрычныя арыентацыі менталітэта ўсходніх славян.

Ментальны крызіс славянскай супольнасці падчас глабалізацыйных працэсаў.

## Тэма 15. Этнічныя каштоўнасці беларусаў

Аксіясфера традыцыйнага беларускага грамадства. Непадзелянасць свету пры роды і чалавека. Старажытныя сімвалы беларусаў. Антрапаморфныя богі. Вера ў магічную сілу слова. Культ памерлых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гнасеалагічная каштоўнасць суснай народнай творчасці беларускага народа.

Гуманістычныя каштоўнасці беларусаў: павага да асобы, давер да “натуральных” схільнасцей і сіл чалавека, права чалавека на задавальненне “натуральных інтарэсаў”, пошукі асабістага шчасця і дабрабыту, права на свабоду.

Мадэль “малога шчасця” беларусаў: здароў’е, дзеці, дабрабыт ў сям’і, гаспадарка, роўнасць, жыццё грамадой.

Прагматызм беларусаў. Практычныя адносіны да свету.

Экацэнтрычныя асновы менталітэта беларусаў. Архетыпічныя ўзроўні ментальнасці беларусаў. Спецыфіка ўспрымання прасторы і часу беларускім этнасам. Ментальны аўтапартрэт беларуса: схільнасць да ўнікальнай ступені цярплівасці, гатоўнасць да дыялогу, адмаўленне радыкальнасці ў вырашэнні праблем, адсутнасць пачуцця выключнасці і г.д. Паняцце дабра і зла. Бог як культурны герой.

Беларуская нацыянальная ідэя як сканцэнтрыраваная сістэма ідэалаў і мэт нацыі.

## Тэма 16. Каштоўнасці сацыялістычнай культуры

Класавы падыход як важнейшы аксіялагічны прынцып савецкай культуры. Дэмакратычны характар сацыялістычнай кльтуры. Свабода творчасці як галоўная каштоўнасць культурнага развіцця ў СССР у 20-я гг. ХХ ст. Жанравая разнастайнасць і тэматычнае багацце авецкага мастацтва. Непарыўнасць этычнага і эстэтычнага ў мастацтве.

Каштоўнасці і іх увасабленне ў культуры сацыялістычнага рэалізму. Гіпертрафіраваны аптымізм у адлюстраванні рэчаіснасці.

Навука і адукацыя – каштоўнасныя прыярытэты савецкай культуры. Патрыятызм, калектывізм і інтэрнацыяналаізм – дамінантныя каштоўнасці сацыялізма.

Духоўна-маральнае ўзвышэнне асобы ў 60-я гг. ХХ ст. Каштоўнасці ўнутранай свабоды асобы, права на шчырасць і сцвярджэнне свайго “я”, адмаўленне напышлівага геразму і наўмыснага пафасу – каштоўнасныя арыентацыі суб’ектаўсавецкай культуры ў перыяд “адлігі”.

Аксіясфера афіцыйнай і неафіцыйнай культуры ў перыяд “застою” (70-80-я гг. ХХ ст). “Катакомбная культура” (андэграунд). Дысідэнцкі рух. Соц-арт як канцэпцыя мастацтва.

Дыфузія неаліберальных каштоўнасцей у савецкую культуру ў перыяд перабудовы і галоснасці. Камерцыялізацыя і творчае спусташэнне значнага масіва культуры ў перыяд трансфармацыі сацылістычнага грамадства.

## Тэма 17. Аксіялагічная спецыфіка культуры ХХІ ст.

Культура ХХІ ст. як важнейшая каштоўнасць. Апрадмечванне духоўнай індывідуальнай творчасці чалавека. Культурная разнастайнасць – важнейшае дасягненне сучаснай цывілізацыі. Абарона культурнай самабытнасці народаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ідэйна-эстэтычная каштоўнасць культурнай спадчыны народаў Усходу. Дыялог культур Усходу і Захаду. Касмізацыя і экалагізацыя культуры. Змена тыпаў культуры. Канфлікт паміж дачаснай інтэлектуальна-тэхнічнай сталасцю і эмацыянальнай адсталасцю.

Каштоўнасныя арыентацыі XXI стагоддзя: прыярытэт пачуццёвага шчасця; асалоды; карысці; камфорта і інш. Крызіс этыкі. Рэлятывізацыя этычных каштоўнасцей. Узрастанне цікавасці да абсалютных каштоўнасцей. Дэвальвацыя пачуццёвага права.

Трансфармацыя даследавання каштоўнаснага ідэала ў сучасных навуках. Крызіс свядомасці. Прымітывізацыя эстэтычных густаў. Іярацыяналізм мастацтва.

Масавая культура (маскульт) і яе псеўдакаштоўнасці.

Кангламератная культура. Станаўленне планетарнай цывілізацыі і яе каштоўнасцей.

### Тэма 18. Сістэма каштоўнасцей у прасторы заходняй культуры

Каштоўнасны патэнцыял заходняй цывілізацыі. Універсальнасць каштоўнасцей цывілізацыі. Цывілізацыйная самасвядомасць і цывілізацыйныя (базавыя) каштоўнасці. Уплыў геапалітычнага становішча, гістарычнага шляху развіцця, своеасаблівасці духоўна-ментальных структур на сістэму каштоўнасцей Захаду. Каштоўнасці заходняй тэхнагеннай цывілізацыі. Прымусовы тып каштоўнасцей заходнееўрапейскай культуры (М.Я. Данілеўскі). Эвалюцыя сэнса паняцця ―духоўнасці‖ у XXI ст. Каштоўнасці заходняй тэхнагеннай цывілізацыі як аснова міжкультурнай камунікацыі.

Іерархія каштоўнасцей заходняй культуры. Індывідуальная свабода як найвышэйшая каштоўнасць заходняй цывлізацыі.

### Тэма 19. Каштоўнасная рэгуляцыя сацыякультурных працэсаў ва ўмовах глабальнай трансфармацыі сучаснага соцыума

Разбурэнне традыцыйнай этнічнай сістэмы каштоўнасцей у перыяд глабалізацыі. Актуалізацыя праблемы узнаўлення духоўна-культурнага адзінства нацыі. Ніверліраванне спецыфічных этнанацыянальных каштоўнасцей пад уплывам глабалізма. Стварэнне цэласнай канцэпцыі цывілізацыйнага развіцця народаў свету. Дасягненне каштоўнаснага кансенсусу. Рэстаўрацыя важных традыцыйных каштоўнасцей як крыніцы фундаментальных навацый. Роля этнанацыянальных каштоўнасцей у глабальным працэсе. Адкрыты, канструктыўны дыялог уласнай сістэмы духоўных каштоўнасцей і каштоўнасцей глабальнай культуры як фактар прагрэса. Сінтэз, узаемапранікненне і ўзбагачэнне альтэрнатыўных каштоўнасцей заходняй і ўсходняй цывілізацый. Каштоўнасны падыход да вырашэння глабальных праблем сучаснасці.

**АКСІЯЛОГІЯ КУЛЬТУРЫТЭМЫ СЕМІНАРАЎ група304 ФК і СКД**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Семінар 1.**

**Тэма: Каштоўнасці і іх сутнасць. Функцыі, тыпы і віды каштоўнасцей**

1. Паняцце каштоўнасці.Адрозненні паняцій: каштоўнасць, норма, ідэал, мэта.

2. Тыпы і віды каштоўнасцей.Функцыі каштоўнасцей.

3. Рэальныя, дэкларуемыя і сімвалічныя каштоўнасці.

**Тэма: Аксіялагічныя асновы культуры**

4. Роля матэрыяльных, духоўных і сацыяльныхкаштоўнасцей у культуры.

5. Рэлігійныя і маральныя каштоўнасці і іх сацыяльныя функцыі.

6. Ідэалогія як выражэнне каштоўнасцей у палітыцы.

7. Навуковыя каштоўнасці.

8. Агульначалавечыя каштоўнасці.

**Семінар 2.**

**Тэма: Каштоўнасны змест прадметных форм культуры**

1.Матэрыяльныя каштоўнасці першабытнай культуры (прылады працы, жыллё і інш.)

2. Сацыяльныя ўстаноўкі, звычаі, рытуалы, табу: іх нарматыўная роля.

3. Рэлігійна-містычныя каштоўнасці. Культ жывёлы. Культ продкаў.

4. Каштоўнасныя прыярытэты: калектывізм, пладавітасць, культ фізічнай сілы, цярплівасць.

**Тэма: Аксіялагічныя асновы культур старажытных цывілізацый Усходу**

5. Аксіялогія культур Месапатаміі.
6. Прадметныя формы духоўнай культуры старажытнага Егіпта.
7. Прадметныя формы духоўнай культуры старажытнага Кітая.
8. Аксіялагічныя асновы культуры старажытнай Індыі.

**Семінар3.**

**Тэма: Аксіялагічнае вымярэнне культуры класічнага арабскага Усходу**

1. Сярэднявяковыя мусульманскія традыцыі і каштоўнасці Іслама.
2. Суна – звод штодзённых звычаяў і правілаў паводзін.
3.Навука і адукацыя – важнейшыя каштоўнасці арабскай культуры.

**Тэма: Матывы каштоўнасных пераваг чалавека ў антычнай культуры**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4.Традыцыйная этыка элінскай арыстакратыі.
5. Полісная дэмакратыя – важнейшая каштоўнасць Старажытнай Грэцыі.
6. Ідэал калакагатыі (прыгожага і добрага), гармонія і мера.
7. Асноўныя каштоўнасці старажытнарымскай культуры.

8. Грамадзянскія дабрачыннасці рымлянаў.

**Семінар 4.**
**Тэма: Матывы каштоўнасных пераваг чалавека ў антычнай культуры**
1. Лацінская мова і рымскае права як сусветная каштоўнасць.
2. Фарміраванне каштоўнасцяў першахрысціян у Рымскай імперыі.

**Тэма: Пераацэнка каштоўнасцей культуры ў эпоху Сярэднявечча**
3. Царкоўна-феадальная ідэалогія.
4. Хрысціянскія каштоўнасці як база культуры.
5. Духоўныя каштоўнасці арыстакраціі і рыцарства.
6. Хрысціянска-язычніцкі сінкрэтызм народнай культуры: каштоўнасны аспект.
7. Эстэтычныя каштоўнасці сярэдневяковай культуры.

**Семінар 5.**
**Тэма: Аксіялагічны кантэкст культуры эпохі Адраджэння**
1. Ідэі гуманізма – аксіялагічная аснова культуры Адраджэння.
2. Гуманістычныя погляды на ўзаемаадносіны індывіда і грамадства.
3. Эстэтычныя і мастацкія каштоўнасці эпохі Адраджэння.

**Тэма: Дыферэнцыяцыя арэала каштоўнасцей у еўрапейскай культуры Новага часу**
4.Аксіялогія руху Рэфармацыі.
5. Супярэчнасць і антынамічнасць грамадскай думкі як адлюстраванне аксіялагічнага дуалізма.
6. Каштоўнасці ў адлюстраванні ідэалістычнай філасофіі XVII ст.
7. Каштоўнасці ў барочнай карціне свету.

**Семінар 6.**
**Тэма: Змена каштоўнасных арыенціраў у эпоху Асветніцтва**
1. Ідэалогія Асветніцтва і каштоўнасці асветнікаў.
2. Тэхнічны прагрэс як новая еўрапейская каштоўнасць.
3. Рацыяналізм як каштоўнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Праект Асветніцтва: ідэі аб ўвасабленні грамадскага ідэала.
5. Трыяда “Свабода– роўнасць– братэрства”.
6.Прагматызм – філасофія карысці.
7.Эстэтычныя каштоўнасці ракако і класіцызма.
8. Эстэтычныя каштоўнасці сентыменталізма.

**Семінар 7.**
**Тэма: Дыялектыка адноснага і абсалютнага ў каштоўнаснай свядомасці грамадства індустрыяльнага свету**
1. Базісныя каштоўнасці культуры індустрыяльнага грамадства.
2. Пераацэнка каштоўнасцей буржуазнай цывілізацыі ў XIX ст.
3.Крызіс хрысціянскага светапогляду і маралі.
4. Крызіс асветніцкіх ідэалаў.Рамантызм як выражэнне новых каштоўнасцей.
5. Дэкаданс як пошук іншых каштоўнасцей і ідэалаў.
6. Практычная рэалізацыя утопіі як ўвасабленне ідэалаў грамадства роўных працаўнікоў.
7. Камуністычныя ідэалы ў канцэпцыі К. Маркса і Ф.Энгельса як працяг заходнееўрапейскай утапічнай традыцыі.

**Семінар 8.**
**Тэма: Сутнасць каштоўнасці сацыякультурнага быцця ўсходнеславянскіх народаў**
1. Традыцыйныя каштоўнасці славянскіх супольнасцей.
2. Каштоўнасці язычніцтва.
3. Каштоўнасці хрысціянства (і праваслаў’я).
4. Язычніцка-хрысціянскі сінкрэтызм.
5.Славянскі этатызм як асобыя каштоўнасные адносіны да дзяржавы.
6.Зямля, прырода і поліэтнічнасць як гістарычная каштоўнасць.
7. Дамінанты ўсходнеславянскай ментальнасці
8. Ментальны крызіс славянскай супольнасці падчас глабалізацыйных працэсаў.

**Семінар 9.**
**Тэма. Этнічныя каштоўнасці беларусаў**
1. Аксіясфера традыцыйнага беларускага грамадства.
2. Вусная народная творчасць беларускага народа як выражэнне найважнейшых духоўных каштоўнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Новыя каштоўнасці, якія фармаваліся на працягу XIX– XX ст. ст.: нацыя, беларуская мова (менавіта як каштоўнасць),самабытнасць, нацыянальная ідэя.
4. Каштоўнасці беларускай нацыі на сучасным этапе культурнай трансфармацыі (пераход ад традыцыйнай да посттрадыцыйнай культуры).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма: Каштоўнасці сацыялістычнай культуры**

5. Ідэалы дэмакратыі, калектывізму, патрыятызму, інтэрнацыяналізму ў сацыялістычнай культуры.
6. Непарыўнасць этычнага і эстэтычнага ў савецкім мастацтве.
7. Навука і адукацыя – каштоўнасныя прыярытэты савецкай культуры.

**Семінар 10.**
**Тэма: Каштоўнасці сацыялістычнай культуры**

1. Каштоўнасці дысідэнцкага руху 60-х.
2. Аксіясфера афіцыйнай і неафіцыйнай культуры ў перыяд –застою” (70-80-я гг. ХХ ст).

**Тэма Аксіялагічная спецыфіка культуры ХХІ ст.**

3. Культурная разнастайнасць і культурная самабытнасць як каштоўнасці сучаснай цывілізацыі.
4. Дыялог культур Усходу і Захаду: узаемаўплыў аксіялагічных сістэм.
5. Геданізм і этычны рэлятывізм сучаснага грамадства.
6. Парадокс спалучэннявысокага ўзроўню тэнічнага прагрэсу і маральнай недасканаласці.
7. Рост інтарэсу да рэлігійных і містычных каштоўнасцей.
8. Станаўленне планетарнай цывілізацыі і яе каштоўнасцей.

**Семінар 11.**
**Тэма. Сістэма каштоўнасцей у прасторы заходняй культуры**

1. Базавыя каштоўнасці заходняй цывілізацыі.
2. Уплыў геапалітычнага становішча і гістарычнага шляху развіцця на сістэму каштоўнасцей Захаду.
3. Каштоўнасці заходняй тэхнагеннай цывілізацыі і іх уплыў на сусветную супольнасць.
4. Іерархія каштоўнасцей заходняй культуры. Індывідуальная свабода як найвышэйшая каштоўнасць заходняй цывлізацыі.
5. Ідэал паспяховасці і –амерыканская мара”.
6. Амерыканская масавая культура і яе ідэйны ўплыў на іншыя культуры свету.
7. Постматэрыялістычныя каштоўнасці ў заходняй культуры (даследавання Р. Інглхарта)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*


1. *Ахиезер, А. С.* Ценности, культура и социальные отношения /А.С.Ахиезер // Модернизация в России и конфликт ценностей: сб. ст. / А. С. Ахиезер; отв. ред.– С. 63.

2. *Выжлецов, Г.П.* Аксиология культуры / Г.П. Выжлецов. – С-П.: Изд-во С-Петербургского ун-та, 1996. – 148 с.

3. *Гуревич, П.С.* Культурология / П.С. Гуревич. – М.: Знание, 1994. – 288 с.

4. *Елизаров, А.Н.* Ценностные ориентации неблагополучных семей / А. Н. Елизаров // Социс. – 1995. – № 7. – С.90 – 99.

5.*Здравомыслов, А.Г.* Потребности. Интересы. Ценности / А. Г. Здравомыслов. – М.: Политиздат, 1986. – 24 с.

6. *Инглхарт, Р.* Постмодерн: меняющиеся ценности и изменяющиеся общества / Р. Инглхарт // Полис. – 1998. – № 4. – С.6 – 26.

7. *Каган, М. С.* Философская теория ценностей / М. С. Каган. – СПб.: Петрополис, 1997. – 205 с.

8. *Крукоўскі, М. І.*Філасофія культуры :уводзны ў тэарэтычную культуралогію : вучэб. дапам. для студэнтаў / М. І. Крукоўскі. – Мінск:Універсітэцкае, 2000. – 187 с.

